Жук Д.С., студент 350 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Колобова И.Н.,
кандидат исторических наук, доцент

# ЭПІДЭМІІ ХАЛЕРЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ХІХ СТ.

Актуальнасць дадзенай тэмы абумоўлена значнасцю праблемы папярэджвання і барацьбы з эпідэмічнымі формамі некаторых інфекцыйных захворванняў. Гісторыя дапамагае разабрацца, як людзі спраўляліся з падобнымі з'явамі ў мінулым, і зрабіць пэўныя высновы для нашай сучаснасці.

Мэта дадзенай работы – даследаваць гісторыю барацьбы з эпідэміямі халеры на тэрыторыі Беларусі ў ХІХ ст.

Пры напісанні артыкула былі выкарыстаны найбольш значныя манаграфіі і электронныя рэсурсы па разглядаемай тэме.

У артыкулах Э. Вальчука разглядаюцца пытанні барацьбы з эпідэміямі халеры, а таксама закранаецца праблематыка гісторыі аптэчнай справы на тэрыторыі Беларусі ў ХІХ ст. У манаграфіі В. Грыцкевіча «С факелом Гипократа» прыведзены звесткі аб папярэджанні хвароб, падрыхтоўцы спецыялістаў і стане лячэбнай справы ў дарэвалюцыйнай Беларусі, апісваецца прафесійная і грамадская дзейнасць лекараў. Мемуары М. Маркса «Записки старика» закранаюць гістарычныя і палітычныя пласты другой паловы ХІХ ст., праблемы аховы здароўя, а таксама ўключаюць вынікі этнаграфічных, геаграфічных і навуковых назіранняў. Даследчык О. Канстанцінава праводзіць агульны агляд гісторыі эпідэмій інфекцыйных захворванняў на беларускіх землях.

На з'яўленне многіх інфекцыйных захворванняў у Еўропе паспрыяла шэраг абставінаў. Пашырэнне гандлю з Індыяй, выцясненне паруснага флота параходным, каланіяльныя войны, пры якіх салдат даволі хутка перавозілі на далёкія адлегласці, спрыялі занясенню халеры ў Заходнюю Еўропу марскім шляхам.

Медыкі не ведалі сутнасці хваробы. Адны лічылі, што эпідэміі выклікаюцца кантагіямі (жывымі ўзбуджальнікамі хваробы), якія перадаюцца ад хворага чалавека здароваму. Іншыя сцвярджалі, што заразныя хваробы распаўсюджваюцца адмысловымі хваробатворнымі часцінамі – «міязмамі», якія выпарваюцца з балотаў, зыходзяць ад трупаў і ўдыхаюцца чалавекам разам з паветрам.

«Холера наведвала тады Еўропу ў першы раз – успамінаў відавочца – і як бы для запалохвання яе лютавала неймаверна. Большай часткай яна ўражвала так хутка, што часу ні на якое б там ні было лячэнне яе не хапала… Народ падаў на вуліцах». Непасрэдны ўплыў на распаўсюд хваробы аказвалі эканамічныя фактары: «Асабліва пацярпелі бедныя габрэі. Амаль тры чвэрці смяротнасцяў упала на іх долю. І гігіенічныя ўмовы іх жыцця, і санітарная абстаноўка, ... – усё варожа дзейнічала на іх, і, здаецца, ніводны хворы з іх не заставаўся пры жыцці» [5, с. 132].

Канец XVIII – першая палова XIX ст. былі для Беларусі часам распаду феадальных і развіцця капіталістычных адносін. Неўраджаі, голад, вайна 1812 г. у значным памеры паўплывалі на эканамічнае становішча і стан здароўя насельніцтва. Больш за ўсё пакутавалі найбяднейшыя пласты насельніцтва. Цяжка працякалі і паўтараліся эпідэміі інфекцыйных захворванняў. Хуткае распаўсюджванне эпідэмій, якія суправаджаліся высокай смяротнасцю, патрабавала рашучых мер. Асабліва высокая смяротнасць была пры эпідэміях халеры [4].

Эпідэміі гэтага захворвання на тэрыторыі Беларусі былі зафіксаваны ў 1831, 1848, 1853, 1866–1867, 1871, 1893–1894 гг.

Новае захворванне прыводзіла да масавай смяротнасці. Ад халеры ў даволі кароткія тэрміны гінула каля паловы тых, хто заразіўся. Насельніцтва ахоплівала паніка.

У беларускія губерні халера была занесена з Царства Польскага ў 1831 г. На Гродзеншчыне яна з'явілася 1 красавіка 1831 г. і працягвалася да 1

кастрычніка, за гэты перыяд на халеру захварэлі 1942 чалавека, лятальнасць склала ад 32% да 52% [2].

Падчас эпідэмій халеры ў паветах, якія падзяляліся на асобныя ўчасткі, адкрываліся павятовыя халерныя камітэты. Лячэннем хворых займаліся служачыя і вольнапрактыкуючыя лекары, валасныя і вясковыя фельчары. Большасць хворых лячылася па дамах, простыя людзі неахвотна паступалі ў бальніцы. Лекі набывалі валасныя праўленні. У ваенна-часовыя бальніцы падчас эпідэмій шпіталізаваліся, нараўне з малодшымі воінскімі чынамі і членамі іх сем'яў, жыхары гарадоў і сельскіх паселішчаў, лячэнне якіх праводзілася за кошт сродкаў Загаду грамадскага догляду. Хворым на халеру лекі даваліся бясплатна [1].

Захаваліся звесткі пра віцебскага лекара К. Гібенталя, які стварыў у горадзе супрацьхалерны камітэт. Па распрацаваным ім плане горад быў падзелены на ўчасткі, да якіх былі прыстаўлены адзін наглядчык з мясцовых жыхароў і адзін урач. У кожным участку было па два вялікія вазы, што вазілі з дамоў і вуліц хворых у лазарэты і мёртвых з дамоў і лазарэтаў у ямы. Пры возе было два служачых, апранутыя ў чорнае, прасякнутае дзёгцем, адзенне [3, с. 146].

За межамі Віцебска былі ўладкованы дзве лякарні, а таксама выкапаны дзве вялізныя ямы для асобнага пахавання хрысціян і габрэяў. Па начах трупы залівалі ў ямах растворам вапны, а па напаўненні яны засыпаліся зямлёю і абліваліся тым жа растворам. Урачэбная ўправа прадпісвала жыхарам назапасіцца хлоркавай вадой, якая павінна была стаяць налітаю на талеркі ў кожным пакоі, і спіртавым настоем струковага перцу для ўцірання пры курчах. Дом, у якім было захворванне, зараз жа ачапляўся вартай, і ні ўваходу, ні выхаду з яго не дазвалялася нікому. Рацыянальныя мерапрыемствы, зробленыя К. І. Гібенталем для ліквідацыі эпідэміі, прывялі да таго, што ў Віцебску з кожных ста хворых памерла толькі 38, у той час як у Віцебскай губерні са ста гінулі 62 чалавекі.

К. І. Гібенталь адмовіўся ад лячэння халеры опіумам і кровапусканнямі і прапанаваў прымяняць пры захворванні водныя і спіртавыя растворы кавы, якія ўзбуджалі прыгнечаную дзейнасць судзінкавай сістэмы. Пры гэтым, па назіранні лекара, вярталася страчаная нармальная цеплыня крыві, актывізаваўся сярдэчны рытм і хворы выратоўваўся.

Кафеін да гэтага часу выкарыстоўваецца пры з'явах паслаблення сардэчна-сасудзістай дзейнасці пры халеры. Так што лекар правільна вырашыў, як трэба лячыць хворых. Бо тады яшчэ не ведалі, што для выводзін пацярпелых з найцяжэйшага стану пры халеры, трэба ўводзіць у вену вялікую колькасць солевых раствораў [3, с. 147].

Падобную ж масавую смяротнасць ад халеры сярод пралетарыяту ў Мінску адзначаў сведка іншай эпідэміі – у 1853 г.: «Асабліва страшная смяротнасць адзначалася ў яўрэйскіх кварталах, якія аказваліся рассаднікам заразы, якая разносіцца адтуль у цэнтр горада. З прычыны неахайнасці і невуцтва ніжэйшых пластоў насельніцтва, асабліва габрэйскага пралетарыяту, дужанне з эпідэміяй абцяжарвалася…» [5, с. 132].

Такім чынам, на беларускіх землях у разглядаемы перыяд у барацьбе з эпідэміямі халеры насельніцтву аказвалася першасная медыка-санітарная дапамога (ізаляванне хворых, дэзінфекцыя памяшканняў і інш.), праводзілася адпаведнае тагачаснаму ўрозню развіцця медыцынскіх ведаў лячэнне, актыўна дапамагалі лекарам валанцёры з грамацкіх таварыстваў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Вальчук, Э. А. Из истории аптечного дела в Беларуси (XVIII – 1861 г.)—/ Э. А. Вальчук [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://cyberleninka.ru/article/n/k-istorii-aptechnogo-dela-v-belarusi-xviii-vek-1861-g/viewer. – Дата доступу : 26.02.2023.

2. Вальчук, Э. А. Из истории борьбы с эпидемиями холеры в западных губерниях Беларуси в XIX веке / Э. А. Вальчук [Электронны рэсурс].

– Рэжым доступу : https://www.elibrary.ru/item.asp?id=36843024. – Дата доступу : 20.02.2023.

3. Грицкевич, В. П. С Факелом Гиппократа / В. П. Грицкевич. – Мінск : Наука и техника, 1987. – 246 с.

4. Константинова, О. В. Эпидемии в истории Беларуси / О. В. Константинова [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://www.dzrcge.by/zdorovyy-obraz-zhizni/informaczionno-obrazovatelnyie-materialyi/epidemii-v-istorii-belarusi.html. – Дата доступу : 26.02.2023.

5. Маркс, М. О. Записки старика / М. О. Маркс. – СПБ : Алетейя, 2021. – 306 с.

Жукова А.Д., студент 317 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Сурба А.В.,
кандидат искусствоведения

# ГИТАРНЫЙ МАСТЕР АНТОНИО ДЕ ТОРРЕС И ЕГО НАСЛЕДИЕ В МИРОВОМ ИСКУССТВЕ

## Краткая история возникновения гитары

Гитара, струнный щипковый музыкальный инструмент, возникший, вероятно, в Испании в начале XVI века и происходящий от латинской гитары, позднесредневекового инструмента с талиевидным корпусом и четырьмя струнами. Ранняя гитара была более узкой и глубокой, чем современная гитара, с менее выраженной талией. Она была тесно связана с виуэлой, инструментом в форме гитары, на котором играли в Испании вместо лютни.

Изначально гитара имела четыре струны, три двойные, а верхняя - одинарная, которые шли от скрипичного колка до натяжного моста, приклеенного к деке, или животу; мост, таким образом, поддерживал прямое натяжение струн. В центре находилось круглое звуковое отверстие, часто украшенное резной деревянной розой.